**БАЛОТНІКАВА С.М.**

# БЕЛАРУСКАЯ АГУЛЬНАКУЛЬТУРАЛАГІЧНАЯ ТЭРМІНАЛОГІЯ І КУЛЬТУРНЫЯ УНІВЕРСАЛІІ

Шматзначнасць паняцця культуры абумоўлена не толькі складанасцю і шматграннасцю з'явы, якую пазначаюць звычайна словам "культура", але і разнастайнасцю магчымых да яе падыходаў, шматлікасцю разрэзаў яе, якія кожны раз могуць выглядаць па-рознаму, хоць перад намі адна і тая ж з'ява.

Назапашванне эмпірычнага матэрыялу аб разнастайных культурах выклікала неабходнасць яго тэарэтычнага асэнсавання, успрыняцця прыналежнасці гэтага матэрыялу менавіта культуры. Гэта неабходнасць і прывяла да стварэння культуралоіі як адносна самастойнай сістэмы ведаў пра культуру, якую пажадана разглядаць як глабальны феномен чалавечага ладу жыцця і як усеагульную характарыстыку свету як цэлага, свету, у якім чалавек знаходзіць сябе.

Узнікненне нейкай навукі абавязкова вымагае стварэння пэўнага катэгарыяльнага апарату, з дапамогай якога можна было б вывучаць, сістэматызаваць, апісваць прадмет даследавання. У дачыненні культуралогіі цяжкасць акрэслення яе тэрміналагічнай сістэмы звязана не толькі з навізной самой навукі і недастатковай распрацаванасцю яе праблематыкі, але і з тым, што культуралогія – гэта сумарнае абазначэнне цэлага комплексу розных навук, якія вывучаюць культурныя паводзіны чалавека і чалавечых агульнасцяў на розных этапах іх гістарычнага існавання (філасофія і гісторыя культуры, этналогія і этнаграфія, культурная і сацыяльная антрапалогіі), тэорыя і сацыялогія культуры, этыка і эстэтыка, тэалогія культуры і інш.)

Спецыфіка нашага аб'екта даследавання ў першую чаргу і заключаецца ў цяжкасці акрэслення ўсёй бязмежнасці тэматычнага поля культуралогіі. У ідэале гэта магла б быць сума назоўнікавых лексем усіх моў, бо за кожным словам стаіць пэўная з'ява, элемент, праява культуры (у шырокім разуменні гэтага паняцця). Магчыма, тэрмінасістэму культуралогіі можна было б утварыць шляхам аб'яднання катэгарыяльных апаратаў усіх навук, якія вывучаюць культуру, тым больш, што сістэмы паняццяў гэтых галін ведаў цесна звязаны між сабой. Але мы ставім за мэту вызначыць з большага тую сукупнасць паняццяў, якая сапраўды можа быць палічана ўласна тэрміналогіяй "агульнага" культуразнаўства, яе ядром.

Па якіх жа параметрах адбіраць неабходныя нам тэрміны, на якой мове апісваць сусвет і чалавека ў ім? На нашу думку, найперш неабходна акрэсліць тры крытэрыі - прасторавы (дадзеныя паняцці павінны існаваць калі не ва ўсіх, то ў большасці нацыянальных культур, і мець адпаведныя найменні ў нацыянальных мовах), часавы (наяўнасць гэтых катэгорый як у прымітыўных культурах, так і ў сучасных) і сутнасны (як і ўсе тэрміны, гэтыя паняцці павінны абазначаць самае істотнае ў межах пэўнай сферы чалавечай дзейнасці, у нашым выпадку – у галіне культуралогіі). Не аналізуючы пакуль адпаведнасць сучасным патрабаванням да тэрміналагічнай лексікі (сістэмнасць, лагічнасць, дакладнасць, наяўнасць

дэфініцый, сцісласць і г. д.), звернемся да гісторыі станаўлення паняццяў, якія можна было б прыняць за першасны пласт агульнакультуралагічнай тэрміналогіі.

Яшчэ здаўна, а у ХХ ст. асабліва, людзі імкнуліся стварыць паверх натуральных нацыянальных моў, паверх навукова-прафесійных жаргонаў, разнастайных штучных моў — метамову, з дапамогай якой можна было б акрэсліць усеадзінае, галоўнае, агульнае, сутнаснае. І заўсёды былі спробы рэканструяваць сусвет на старажытнай натурфіласофскай мове "чатырох стыхій". Але прыродным першаэлементам *"зямля", "вада", "паветра", "агонь"* была не зусім падуладна духоўная сфера, яны не закраналі чалавека, яго сутнасці і месца ў прыродзе.

У мінулых стагоддзях "філасофія культуры" як адносна самастойная галіна філасофіі спрабавала сінтэзаваць тэорыі аб сутнасці і значэнні культуры як сферы духоўнага жыцця, і асноўным тут было пытанне аб існаванні культурных універсалій, якія маглі б стаць падмуркам для асэнсавання як культуры у цэлым, так і яе паасобных праяў. У якасці такіх універсалій як нормаў культуратворчасці разглядаліся: 1) агульназначымыя часавыя каштоўнасці - лагічныя, эстэтычныя, маральныя (духоўныя) (Віндэлъбанд, Рыкерт); 2) лагічныя асновы розных сфер культуры (Коген, Наторп); 3) сімвалічная дзейнасць як субстанцыянальная аснова ўсіх сфер культуры, разуменне з'яў культуры як сімвалічных формаў (Касірэр); 4) універсальныя структуры каштоўнаснай свядомасці (Шэлер); 5) уяўленні пра псіхабіялагічнае адзінства чалавецтва (Юнг); 6) ідэі аб восевай першааснове сэнсу культуры, у адносінах да якога сэнсы ўсіх яе наступных разнавіднасцяў з'яўляюцца свайго роду прыватнымі шыфрамі (Ясперс) [Философия 1997: 345].

У 1959 годзе амерыканскі антраполаг Дж. Мэрдак вылучыў больш за 70 культурных універсалій – агулъных для ўсіх культур элементаў: *узроставая градацыя, спорт, нацельныя ўпрыгожанні, каляндар, захаванне чысціні, гатаванне ежы, час прыняцця ежы (снеданне, абед, вячэра), кааперацыя працы, касмалогія, заляцанне, танцы, дэкаратыўнае мастацтва, адукацыя, эсхаталогія, этыка, этнабатаніка, этыкет, шлюб, сям'я, сваяцкія групы, адносіны да цяжарных, пасляродавы догляд, святы (святкаванне), здабыванне агню, пахавальныя рытуалы, рэлігійныя рытуалы, гульні, урад, гігіена, хатняя гаспадарка, забарона кровазмяшэння (інцэсту), сексуальныя абмежаванні, права спадкаемства, жарты, медыцына, міфалогія, гандаль, назіранне за надвор'ем, пакаральныя санкцыі* і г. д. Больш кароткі спіс культурных універсалій прапанаваў К.Уіслер, які вызначыў усяго 9 фундаментальных рыс, уласцівых усім культурам. Ён назваў іх універсальнымі патэрнамі: *мова, матэрыялъныя рысы, мастацтва, міфалогія і навуковыя веды, рэлігійная практыка, сям 'я і сацыяльная сістэма, уласнасць, урад, вайна* [Кравченко 2000: 300].

Як бачым, культурныя універсаліі (ад лац. universalis – агульны, усеагульны) адлюстроўваюць нормы, каштоўнасці, правілы, традыцыі, аспекты культуры, якія маюць усеагульны характар, прысутныя на ўсіх этапах развіцця чалавецтва і не залежаць ні ад геаграфіі месца, ні ад гістарычнага ладу грамадства. Іх узнікненне абумоўлена агульнасцю антрапалагічных і сацыяльных патрэб і інтарэсаў чалавецтва, звязана з адзінствам фізічных і псіхічных характарыстык людзей, з

неабходнасцю падтрымліваць устойлівае біялагічнае ўзнаўленне папуляцыі і рэтрансляваць сацыяльны вопыт, захоўваць сацыяльную кансалідацыю грамадстваў, аказваць узаемадапамогу ў сітуацыі бедстваў і да т. п. На нашу думку, менавіта культурныя універсаліі і з'яўляюцца тым зыходным пластом, які павінен стварыць ядро агульнакультуралагічнай тэрміналогіі.

Шырыня тэматычнага поля, якое акрэсліваюць культурныя універсаліі, вымагае высокую ступень семантычнай канцэнтрацыі, насычанасці гэтых паняццяў. З аднаго боку, яны самі з'яўляюцца тэрміналагічнымі ўтварэннямі, з другога — вяршынямі тэматычных, паняційных канцэнтрумаў, за якімі стаяць пэўныя групы лексем, што ў сваю чаргу таксама маглі б служыць матэрыялам для фарміравання тэрміналагічнай базы культуралогіі.

Менавіта высокая ступень абагульнення разам з неўсталяванасцю універсалій як тэрмінаў выклікае, на нашу думку, і разнастайнасць структуры даных тэрміналагічных спалучэнняў. Менш паловы з іх з'яўляюцца простымі аднаслоўнымі тэрмінамі, пераважна невытворнымі назоўнікамі грэка-лацінскага паходжання *(этыка, адукацыя, спорт, музыка, каляндар, медыцына, гігіена, паліцыя),* а таксама назоўнікамі, утворанымі з дапамогай суфіксоідаў *(касмалогія, эсхаталогія, міфалогія).* У большасці сваёй гэтыя тэрміны двухслоўныя (пераважна назоўнікавыя атрыбутыўныя словазлучэнні: *узроставая градацыя, рэлігійныя рытуалы, пасляродавы догляд, сексуальныя абмежаванні, хатняя гаспадарка, права спадкаемства, нацельныя ўпрыгожанні),* трохслоўныя *(час прыняцця ежы, вера ў цудоўнае вылячэнне (пазбаўленне), выраб прылад працы, улагоджванне звышнатуральных сіл, адвучэнне дзіцяці ад грудзей)* і нават мнагаслоўныя *(прыстойнасць у спраўленні натуральных патрэб; звычаі, звязаныя з надыходам палавой спеласці).*

Акрэсленне тэрміналагічнай лексікі любой навукі – справа складаная, а спецыфіка нашага аб'екта даследавання вымагае найбольшай увагі пры адборы лексічных сродкаў. Але нам падаецца апраўданым і мэтазгодным уключыць культурныя універсаліі ў склад агульнакультуралагічнай тэрміналогіі, прычым пакласці гэтыя паняцці ў яе аснову, у ядро, якое на самай справе павінна адлюстроўваць самыя сутнасныя, агульныя і вызначальныя культурныя формы.

Літаратура:

1. Бабахо В.А., Левикова С.И. Культурология: Программа базового курса, хрестоматия, словарь терминов. — М, 2000. – 400 с.
2. Кравченко А.И. Культурология: словарь. - М: Академический Проект. 2000. - 671 с.
3. Крукоўскі М.І. Філасофія культуры: уводзіны ў тэарэтычную культуралогію: Вучэб. дапам. - Мн.: Універсітэцкае, 2000. — 192 с.
4. Философия: Учебник для высших учебных заведений. — Ростов н/Д.: “Феникс”, 1997. – 576 с.